сцвярджаць пра існаванне арыгінальнай полацкай школы жывапісу.

**ПОЛІСЕМІЯ** (ад грэч. poly многа + sēma знак), мнагазначнасць, наяўнасць у адной моўнай адзінкі некалькіх значэнняў, якія звычайна з'яўляюцца вынікам развіцця першаснага значэння. У аснове П. – асіметрыя моўнага знака, якая заключаецца ў выкарыстанні абмежаванай колькасці знакаў для найменне неабмежаванай колькасці рэалій. Значэнні полісемічнай адзінкі ўтвараюць яе семантычную структуру. Паміж значэннямі існуе семантычная сувязь, якая выражаецца ў наяўнасці ў іх агульных элементаў сэнсу — сем. У лінгвістыцы пад П. звычайна разумеюць лексічную мнагазначнасць. У бел. мове каля 25% слоў — мнагазначныя. Адрозніваюць 2 тыпы лексічнай П., заснаваныя на розных відах моўнай матываванасці: сувязі паводле падабенства, напр., формы, месцазнаходжання, функцыі (скрутны від — від пачуццяў; хвост жывёлы — хвост цягніка; гусінае пяро — сталёвае пяро) і сувязі паводле сумежнасці, напр. дзеянне — вынік, частка — цэлае (варэнне ягад — ягаднае варэнне, густы бас — знакаміты бас, дубовы стол — урачысты стол).

*Літ.*: Старычонак В.Д. Полісемія ў беларускай мове (на матэрыяле субстантываў). Мінск, 1997. *Д.В.Дзятко.*

**ПОЛІСТРАФІ́ЧНАСЦЬ** (ад грэч. poly многа + *страфа*), паслядоўнае або адвольнае чаргаванне ў вершаваным творы розных *строф*, графічна адззеленых адна ад адной. Да полістрафічных адносяцца разнастрофныя вершы, а таксама раўнастрофныя з сіметрычным чаргаваннем 2 ці больш відаў строф. Полістрафічнымі звычайна бываюць буйныя вершаваныя творы, кожная ч. якіх пішацца сваёй страфой. Напр., у 10 раздзелах паэмы Я.Купалы «Безназоўнае» ўжываюцца чатырохрадкоўі 8 разнавіднасцей і шасцірадкоўі 2 разнавіднасцей. У паэме М.Танка «Нарач» сустракаюцца і чатырохрадкоўі самых розных мадыфікацый, і пяцірадкоўе, і астрафічны верш. П. надае вершаванаму твору разнастайнасць формы, дапамагае лепш выявіць змены лірычнага перажывання паэта і яго герояў.

*В.П.Рагойша.*

**ПОЛІФАНІЯ**, паліфонія (грэч. ад poly многа + phōnē гук), 1) від шматгалосся, заснаваны на спалучэнні 2 і больш самаст. па значэнні меладычных ліній (галасоў). Сутнасць паліфанічнага складу ў лінеарнай (паслядоўнай) будове муз. тканіны, кожны голас якой дзякуючы багаццю ўнутраных меладычных сувязей і несіметрычнаму развіццю рытму набывае асаблівую цэласнасць і адзінства. У гісторыка-культ. прасторы П. вылучаюцца 3 стадыі: ранняя П., класічная і сучасная. Ранняя характарызуецца неўпарадкаванымі з'явамі імправізацыйна-варыянтнага мыслення з элементамі гетэрафоніі. Каардынацыя галасоў узнікае эпізадычна побач з шэрагам унісонных злучэнняў. Склалася ў межах музыкі вуснай традыцыі фалькл. тыпу і ўяўляе вобраз першаснага шматгалоснага мыслення, якое характэрна



*Да арт. Полацкія фрэскі. Фрэска Грамніцы ў Спаса-Праабражэнскай царкве.*